ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

7 СНЕЖНЯ 2017 г. ЧАЦВЕР №236 (28600)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Інтэрнэт-імідж педагога**



**У рэйд з участковымі**



**Па Італіі на веласіпедзе**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Кірыл МАЛАДЦОЎ, намеснік міністра энергетыкі Расійскай Федэрацыі:**

*«Беларусь і Расія ўжо ўзгаднілі індыкатыўны баланс паставак нафты на будучы год. Баланс звярстаны, усё — як і меркавалася: 24 млн тон нафты. Згодна з раней дасягнутымі дамоўленасцямі, на працягу шасці гадоў, да 2024-га, пастаўкі нафты з Расіі ў Беларусі будуць дасягаць аналагічнага аб'ёму — 24 млн тон. Пры гэтым 18 млн тон будуць накіраваны на беларускія нафтаперапрацоўчыя заводы, а 6 млн тон — на экспарт. За перыяд са студзеня па лістапад 2017 года аб'ём паставак нафты з Расіі ў Беларусь склаў 16,4 млн тон, што ў цэлым адпавядае раней дасягнутым дамоўленасцям».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 7.12.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 2,0252 | ▲ |
| Еўра | 2,3956 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0343 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0747 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# ЁЛАЧКА, ЗАПАЛЬВАЙСЯ!



Манцёр-высотнік электрасеткавага раёна №5 унітарнага прадпрыемства «Мінскгарсвятло» Віталь ГРЫБОВІЧ упрыгожвае электрагірляндамі, дыёдамі, лямпамі і ліхтарыкамі навагоднюю ёлку, якую гэтымі днямі паставілі на сталічнай плошчы Незалежнасці.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Даступная дабрыня

## Патрэбныя людзі! Сагрэць душу...

**Як дапамагчы іншым, не аддаючы вялікіх грошай**



**Чую слова «дабрачыннасць» — і першая думка, што прыходзіць у галаву: «Ахвяраваць грошы». Беднаму, што стаіць на вуліцы з працягнутай рукой, ці хвораму дзіцяці, на лячэнне якога не хапае сродкаў... Вікторыя КРУТ, якая арганізавала валанцёрскі рух «Патрэбныя людзі», лічыць інакш: «Не трэба мець еўравыя рахункі, каб ладзіць святы ў дзіцячых дамах ці ў дамах састарэлых. Калі мы едзем, то кожны набывае па торціку і ўпакоўку соку — і ў добрым настроі прыязджаем у госці. Нічога нерэальнага. Атрымліваецца незатратна, але душэўна».**

СТАР. 4

■ Жыллё

## КАБ ВЫБАР БЫЎ ПА КІШЭНІ...

### Актуальныя трэнды Мінска: мінімальныя плошчы і адсутнасць нават чарнавога аздаблення

**Пяты месяц на першасным рынку нерухомасці сталіцы пануе ажыўленне. Патаннелыя крэдыты і малыя цэны падштурхнулі насельніцтва вырашаць жыллёвае пытанне сёння. Аб тым, што цяпер выбіраюць пакупнікі, якія праекты найбольш запатрабаваныя і якія канкурэнтныя перавагі ў барацьбе за пакупніка забудоўшчыкі выкарыстоўваюць, расказала Юлія ШАБРОВА, памочнік па маркетынгу кіраўніка групы кампаній «Твая сталіца».**

Узровень попыту на навабудоўлі за апошнія паўгода вырас на трэць. Пры гэтым пакупніцкая цікавасць размяркоўваецца нераўнамерна — гэта мы бачым, аналізуючы статыстыку даведніка па навабудоўлях (партал ProMetr.by): асобныя праекты істотна выйграюць у канкурэнтаў. Так, скажам, аб'ектам на Дзяржынскага, 15 цікавасць у паўтара—два разы часцей, чым іншымі ў гэтым жа раёне. І прычына нават не ў цане квадратнага метра, а ў высокай ступені гатоўнасці аб'екта, невялікіх плошчах кватэр і, што немалаважна, надзейнай рэпутацыі забудоўшчыка.

### Гігантызм сыходзіць у мінулае

Разумеючы пажаданні пакупнікоў і іх фінансавыя складанасці, забудоўшчыкі ідуць насустрач попыту і імкнуцца зрабіць свае аб'екты больш канкурэнтаздольнымі за кошт паменшэння вынікоўай цаны кватэр і стварэння ў жылых комплексах адзінага сучаснага сацыяльнага асяроддзя.

СТАР. 4

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!
ПАДПІШЫСЯ — І ВЫЙГРАЙ ГАЗАВУЮ ПЛІТУ ЦІ МІКРАХВАЛЁЎКУ!
Працягваецца падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2018 года!
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!